# НЕЗАБЫЎНАЯ МЕЛОДЫЯ СЭРЦА

## ІНТЭРВ'Ю з КАМПАЗІТАРАМ ДЗМІТРЫЕМ ДАЎГАЛЁВЫМ

*<u>Крыніца публікацыі:</u> Даўгалёў, Д.М. Незабыўная мелодыя сэрца: [інтэрв'ю з кампазітарам Дзмітрыем Даўгалёвым] / гутарыла Зоя Падліпская; фотаздымкі Аляксандры Шпартавай // Роднае слова. – 2013. –№ 2. – С. 93-95.*



29 студзеня 2013 г. у культурным жыцці краіны адбылася значная падзея – у зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі зладзілі свой аўтарскі канцэрт кампазітар Дзмітрый Даўгалёў і паэт Уладзімір Пецюкевіч. Абодва – юбіляры. У снежні мінулага года кампазітару споўнілася 50 гадоў, а ў сакавіку 2013 г. паэт Уладзімір Пецюкевіч рыхтуецца адзначыць сваё сямідзесяцігоддзе.

У мастацкім багажы юбіляраў шмат разнажанравых твораў, такіх як араторыя "Зорка палын", кантата"Дарога – сцяжына матулі і сына", сімфа-рок-опера "Агонь Праметэя". Але найбольш вядомыя творы славутага тандэма – песні "Гаю мой, не кліч", "А ты кажаш: вясна", "Зараніцы", "Белая лілея", "Балада", "Пажадай мне, мама", "Застольная", "Азярцо", "Рэха жураўлінае", "Голуб галубку цалуе", "Мілая спадарыня", "Нарач". А калі ўзгадаць песні Дзмітрыя Даўгалёва на вершы іншых паэтаў, то трэба адзначыць "Обманите меня", "Погоди", "Телеграммы", "Две звезды", "Не судьба", "Через все граннцы", "Разводные мосты", "Панн Гражнна", "Птнцы".

Творчае супрацоўніцтва кампазітара Дзмітрыя Даўгалёва і паэта Уладзіміра Пецюкевіча пачалося ў далёкім 1985 годзе з балады "Поле горкіх палыноў", якую ўпершыню выканалі народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка і ансамбль "Сябры". Другая песня "Гаю мой, не кліч" напісаная ў 1986-м, стала для творцаў своеасаблівай візітоўкай, слухачам яна запомнілася ў непараўнальным выкананні нашага славутага Песняра – заслужанага артыста Беларусі Валерыя Дайнэкі.

Песні і балады Дзмітрыя Даўгалёва і Уладзіміра Пецюкевіча – частыя госці на міжнародных конкурсах. Толькі на адным "Славянскім базары" яны маюць тры перамогі. У 1999 г. Ірына Дарафеева з "Баладай" атрымала першую прэмію, у 2005-м Паліна Смолава з баладай "Рэха жураўлінае" ўзяла Гран-пры, у 2006-м Наталля Гардзіенка (Малдова) з песняй "Азярцо" – першую прэмію. Балада"На гнядым звінела срэбраная збруя" хутка стала рэпертуарным творам конкурсаў і выйшла за межы Беларусі. Так, у 2008 г. на міжнародным конкурсе "Пуцёўка да зор" (Масква) Вераніка Чарняўская з "Баладай" атрымала Гран-пры, а ў 2009-м на міжнародным конкурсе "ТеремОК!" (Санкт-Пецярбург) маладая расійская спявачка Анастасія Цітова з гэтай жа "Баладай" была таксама ўганаравана Гран-пры.

Сёння госць нашага часопіса - кампазітар Дзмітрый Даўгалёў.

– **Дзмітрый, віншую Вас з юбілеем і аўтарскім канцэртам.**

– Дзякуй.

– **Хто дапамагаў Вам зладзіць такі запамінальны вечар?**

– Першы, каму хочацца падзякаваць, гэта Гасподзь Бог. Ён даў крылы, надзею, жаданне і цярпенне. Велізарны дзякуй Міністэрству культуры за фінансавую падтрымку. Без яе наша вечарына не адбылася б. Таксама хачу сказаць словы падзякі кіраўніцтву і супрацоўнікам Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Асобны дзякуй артыстам і рэжысёру канцэрта Ніне Осіпавай. А яшчэ нам дапамагла цудоўная, шчырая публіка, якая знайшла магчымасць, час і адкрыла сваё сэрца нашым мелодыям.

– **Ці была ў Вас упэўненасць перад канцэртам, што будуць раскуплены амаль усе білеты? Тым больш што тэатральнае жыццё Мінска ў гэтым сезоне даволі насычанае.**

– Упэўненасці не было. Была надзея, што на канцэрт прыйдуць нашы з Уладзімірам Пецюкевічам сапраўдныя паклоннікі. Так і адбылося, толькі я не думаў, што іх будзе столькі.



Дзмітрый Даўгалёў і Уладзімір Пецюкевіч за раялем.

– **На канцэрце прагучалі не толькі Вашы творы, напісаныя раней, але і новыя балады і песні. Калі ласка, раскажыце пра прэм’еры.**

– Прэм’еры складалі амаль палову праграмы канцэрта. Гэта "Ой, зіма-зіма",

"Не кувай, зязюленька", "Незабыўная мая", "Не спяшайся, восень" у выкананні Валерыя Дайнэкі, "Шчабятуня-ластаўка" і арыоза Праметэя ў выкананні Пятра Елфімава, "Туба" ў выкананні Аляксандра Ціхановіча і Ядвігі Паплаўскай, "Ты пачуй мяне" ў выкананні Вячаслава Ісачанкі.

Маладыя спевакі таксама парадавалі: Анастасія Арцемева выканала "Клён з таполяю" і "Акеаніды" з оперы "Агонь Праметэя", Вольга Клімовіч – баладу "Ой, ляці, казачанька", Валянціна Альшанская – баладу "Гусі-лебедзі", Наталля Кірыенка – песню "Льецца кахання рака". Яшчэ была прэм’ера інструментальнай кампазіцыі "Круіз", якую выканалі Ігар Ляўчук на блок-флейце і я - на раялі.

**– Дзмітрый, а яшчэ была прэм’ера песні “Летуценніца” ў выкананні Уладзіміра Стамаці, Пятра Елфімава і Вашым (за раялем). Гэтая песня нагадала слухачам лепшыя песняроўскія традыцыі. На Ваш погляд, песняроўскія традыцыі – што гэта такое?**

– На гэтае пытанне лепш адказаў бы Уладзімір Мулявін. Ён прапусціў беларускую народную песню праз геніяльную прызму свайго музычнага інтэлекту, сабраў лепшыя галасы, музыкантаў і явіў свету непадобнае ні на што, новае гучанне. За песняроўскія традыцыі, якія часткова прысутнічаюць у маёй творчасці, мне не сорамна. Яны нашы, родныя. У іх чыстых, крыштальных крыніцах чэрпалі сваё натхненне цэлыя пакаленні слухачоў і музыкантаў. Я таксама выхоўваўся на “Песнярах”.

**– На Вашым канцэрце выступалі салісты "Песняроў" розных гадоў.**

– Так. Валерый Дайнэка, Уладзімір Стамаці, Пётр Елфімаў і Вячаслаў Ісачанка ці маюць, ці мелі дачыненне да знакамітага калектыву.

**– Ці задаволены Вы супрацоўніцтвам з маладымі выканаўцамі, якія ўдзельнічалі ў Вашым аўтарскім канцэрце?**

– Пасля канцэрта мой тэлефон быццам “расчырванеўся”. Усе мае сябры, знаёмыя, якія прысутнічалі на канцэрце, быццам “спеліся” і задавалі адно і тое ж пытанне: “Дзе ты знайшоў такіх прыгожых і галасістых маладых спевакоў?”

Я вельмі задаволены маладымі выканаўцамі, веру ў іх і буду далей з імі працаваць.

**– А як усё ж Вы іх знаходзілі?**

– Я знайшоў Анастасію Арцем’еву і Пятра Елфімава, калі шукаў выканаўцаў на ролі Акеанід і Праметэя ў рок-оперу "Агонь Праметэя". Мяне знайшлі Валянціна Алыпанская, Вольга Клімовіч, а таксама Наталля Кірыенка. Асобна хачу сказаць пра Вераніку Чарняўскую.

Спачатку таленавітая спявачка знайшла маю “Баладу”, потым “Балада” знайшла яе. Пазней “Балада” нас і пазнаёміла.

**– Дзмітрый, як Вы адчуваеце, ці прымае сучасная моладзь тую музыку, якую Вы ствараеце? Ці не дарэмныя намаганні захаваць традыцыі?**

Цікавае і цяжкае пытанне. На яго можа адказаць SMS, якую мне даслала Валянціна Бандарэнка ў перапынку нашага з Уладзімірам Пецюкевічам аўтарскага канцэрта. «Чула, як малады чалавек сказаў у антракце дзяўчыне: "Дзеля такога варта жыць! "»

**– Чым Вам блізкі Ваш суаўтар Уладзімір Пецюкевіч?**

– Я люблю ягоныя меладычныя вершы, вобразы, метафары. Люблю ягоную беларускую мову. Яна мілагучная, сапраўдная, лагодная і шчырая.

**– Вашы балады – сапраўдныя жамчужыны і Вашага з Уладзімірам Пецюкевічам аўтарскага канцэрта, і ўвогуле сумеснай творчасці. У іх заўсёды цікавая, незвычайная форма, драматургія. Што на гэта ўплывае?**

– На гэта ўплывае, перш за ўсё, дух, вобраз, рытміка і рыфміка верша. А музыка павінна дапоўніць усё пералічанае і ўзмацніць эмоцыі, якіх у баладах Уладзіміра Пецюкевіча больш чым дастаткова. Падняць гэтыя паэтычныя глыбіні дапамагае прафесія кампазітара, якой я вучыўся ў народнага артыста СССР, прафесара Яўгена Аляксандравіча Глебава.

**– Хто аўтар аранжыровак Вашых песень і балад, якія прагучалі ў канцэрце?**

– "Гаю мой, не кліч" аранжыраваў Ігар Карня-левіч, “"Палачаначку-князёўну" – Раман Козыраў. Усе астатнія зрабіў я.

**– Музычная крытыка не раз адзначала і давала высокую ацэнку "аркестраваму мысленню" Вашых балад і песень. Гэта вынік вучобы ў кансерваторыі?**

– Па-першае, я з дзяцінства люблю сімфанічны аркестр, юнаком граў на кантрабасе. Памятаю прыгожыя адчуванні, калі ў школьным аркестры мы гралі творы славутых класікаў: Моцарта, Вівальдзі, Чайкоўскага. Гэта са мной назаўсёды. Па-другое, адчуваю і лічу, што выразных сродкаў музыкі, больш дасканалых, чым сімфанічны аркестр, чалавецтва пакуль яшчэ не прыдумала. Дарэчы, лепшая класічная музыка напісана для аркестраў. Па-трэцяе, Вы правільна заўважылі – вучоба ў Майстра аркестроўкі Яўгена Глебава таксама спрыяла развіццю гэтага мыслення.

**– На Вашым канцэрце акампанементам для салістаў гучалі ў тым ліку і аркестравыя фанаграмы. А чаму на сцэне не было жывога аркестра?**

– На гэтае пытанне лепшы адказ атрымаўся б у дырыжораў тых аркестраў, якія сапраўды маглі б сваёй прысутнасцю і прафесійным

выкананнем упрыгожыць сцэну філармоніі. Чаго не адбылося. Але дзякуй Богу, што працавала апаратура, на сцэне стаяў раяль "Steinway", а да мікрафона выходзілі сапраўдныя зоркі беларускай эстрады.

**– Ці імкнецеся Вы да папулярнасці?**

– Шчыра кажучы, не зусім уяўляю, навошта і якімі сродкамі можна да яе імкнуцца. Папулярнасць, слава... Кампазітар Васіль Салаў'ёў-Сядой з гэтай нагоды неяк добра сказаў: "Слава приходит между делом, если дело того стоит". Папулярнасць і значнасць – розныя субстанцыі. Дык вось першая хутка прыходзіць, хутка адыходзіць. А значнасць, як тое золата, намываецца па крупінцы гадамі, дзесяцігоддзямі. Гэта зароблены аўтарытэт, які застаецца на ўсё астатняе жыццё.

**– Дзмітрый, у Вас прыгожая шматдзетная сям'я: дзве дачкі, сын, жонка. Што для Вас сям'я? Ці не перашкаджае яна творчасці?**

– Сям'я для мяне – гэта сэнс жыцця. Ні ў якім разе не клопат і цяжар, наадварот, моцная падтрымка. Сям'я не можа перашкаджаць творчасці. Мае дочкі сваімі ясназорымі вочкамі грэюць сэрца, сваімі звонкімі галасамі запісваюць усе мае дзіцячыя песні, сваімі ручкамі граюць п'есы для фартэпіяна, якія час ад часу пішу спецыяльна для іх. Старэйшы сын мяне таксама радуе сваёй вучобай і мэтанакіраванасцю. А яшчэ ў сям'і галоўнае – каб каханая жанчына добра разумела, што такое быць паловай творчага чалавека, тым больш кампазітара. Мне ў гэтым сэнсе пашанцавала.

**– А ёсць у Вашым жыцці нешта такое, што стрымлівае працэс напісання новых твораў?**

– Ёсць. І не ў мяне аднаго. Гэта недахоп матэрыяльных сродкаў. Але ў гэтым я не бачу трагедыі – нават тады, калі мне не хапае грошай, я ўсё роўна займаюся музыкай, толькі не сваёй. Дзякуй за ўсё Богу!

Гутарылй Зоя ПАДЛІПСКАЯ.

*У матэрыяле выкарыстаны фотаздымкі Аляксандры Шпартавай.*